# Мастацкае асэнсаванне асобы пісьменніка і грамадскай рэчаіснасці пачатку XX стагоддзя ў беларускім рамане 1980–90-х гадоў

УДК 821.161.3-31(091):94(476)«19»



**Ганна НАВАСЕЛЬЦАВА, кандыдат філалагічных навук, дацэнт**

Ганна НАВАСЕЛЬЦАВА. Мастацкае асэнсаванне асобы пісьменніка і грамадскай рэчаіснасці пачатку XX стагоддзя ў беларускім рамане 1980–90-х гадоў. У артыкуле разглядаецца адметнасць мастацкага ўзнаўлення псіхалагічных партрэтаў знакамітых асоб беларускага прыгожага пісьменства. Янка Купала (раман-эсэ «Як агонь, як вада…» А. Лойкі), Цётка (раманная дылогія з узмоцненай біяграфічнай асновай «Крыж міласэрнасці» В. Коўтун), Максім Багдановіч (раман-даследаванне «Каханне і смерць, або Лёс Максіма Багдановіча» Я. Міклашэўскага) раскрываюцца ў творчым і грамадскім асяроддзі.

Ключавыя словы: раман, раман-эсэ, раман-даследаванне, раманная сітуацыя, галоўны герой, мікраасяроддзе, грамадскае асяроддзе.

Anna NOVOSELTSEVA. Artistic understanding of the writer's personality and the social realities of the early 20th century in the Belarusian novel of the 1980s -90s. The article discusses the features of artistic reproduction of psychological portraits of famous personalities of Belarusian fine literature. Yanka Kupala (novel-essay "Like fire, like water…" by A.Loiko), Tsetka (novel dilogy with an enhanced biographical basis "Cross of Mercy" by V. Kovtun), Maxim Bogdanovich (novel-study "Love and death, or the fate of Maxim Bogdanovich" by Ya.Miklashevsky) are portrayed in the creative and social environment.

Keywords: Novel, novel-essay, novel-research, novel situation, protagonist, micro-environment, social environment.

У буйной прозе ўзаемадзеянне героя з акаляючай рэчаіснасцю вырашаецца праз канфліктныя адносіны, у выніку чаго разглядаюцца маральна-этычныя вартасці, актуальныя для грамадства, адбываецца зварот да нацыянальнага духоўнага вопыту, фармулюецца філасофская канцэпцыя асобы і свету. У апошняй трэці XX стагоддзя беларускі раман, які да гэтага часу назапасіў значны эстэтычны вопыт, звяртаецца да мастацкага асэнсавання асобы, якая зрабіла вялікі ўклад у развіццё айчыннай літаратуры і культуры. У цэнтры ўвагі пісьменнікаў – знакавыя постаці дзеячаў пачатку XX стагоддзя: Янкі Купалы, Максіма Багдановіча, Цёткі. Жыццёвы і творчы шлях як прадмет адлюстравання абумоўлівае адметную змястоўную форму твора, актывізуе паасобныя жанраўтваральныя працэсы.

## ПРА АЎТАРА

НАВАСЕЛЬЦАВА Ганна Віктараўна.

Нарадзілася ў г. Віцебску. Скончыла Віцебскі дзяржаўны ўніверсітэт імя П.М. Машэрава (2006), аспірантуру пры ім (2009). З 2009 года – выкладчык кафедры беларускай літаратуры ВДУ імя П.М. Машэрава, з 2015 года – дацэнт кафедры літаратуры.

Кандыдат філалагічных навук (2013), дацэнт (2016).

Аўтар больш як 30 навуковых прац, у тым ліку адной манаграфіі.

Сфера навуковых інтарэсаў: жанр рамана ў беларускай літаратуры другой паловы XX – пачатку XXI стагоддзя.


Алег Лойка

У беларускай прозе прадстаўлены розныя мастацкія варыянты творчага ўзнаўлення біяграфіі айчыннага пісьменніка. Значную ступень аўтарскай свабоды для стварэння літаратурнай біяграфіі адкрывае раман-эсэ, што пацвярджаюць творчыя ўзоры Алега Лойкі, які звяртаецца да шматграннага асэнсавання знакамітых мастакоў слова і культурных дзеячаў – Янкі Купалы, Францыска Скарыны, Уладзіміра Караткевіча. Калі ў творах «Як агонь, як вада…» (1984) і «Францыск Скарына, або Сонца Маладзіковае» (1990) асобы класікаў прыгожага пісьменства паказаны з часавай аддаленасці, то ў творы «Уладзімір Караткевіч, або Паэма Гарсія Лойкі» (2009) створаны вобраз сучасніка і сябра пісьменніка. Аднак незалежна ад выбранай творчай асобы А. Лойка раскрывае яе псіхалагічны партрэт, узвышае над асяроддзем, абмяжоўвае час і прастору раманнага дзеяння жыццём героя.

Адметнасць творчай асобы, высокую ступень яе знакавасці трапна акрэслівае І.В. Саверчанка, які пераканаўча сцвярджае, што «геніяльны майстар слова Янка Купала сфармуляваў доўгатэрміновую праграму нацыянальнага жыцця, акрэсліў філасофію беларускага адраджэння і развіцця беларусаў як асобнай нацыі» *[1, с. 5]*. Арыгінальнасць кнігі «Як агонь, як вада…», якая фактычна з’яўляецца дакументальна-мастацкай біяграфіяй вялікага народнага паэта Беларусі, адзначае вядомы даследчык Д.Я. Бугаёў, паколькі мастацкія і дакументальна-мастацкія творы «пра выдатных дзеячаў літаратуры пішуцца даўно. Яны ўжо маюць трывалую традыцыю ў многіх народаў» *[2, с. 193]*. І.Ф. Штэйнер аўтарытэтна заўважае, што «Алег Лойка першым расказаў пра Купалу як пра геніяльнага, але ўсё ж такі рэальнага чалавека з хібамі» *[3, с. 17]* у дакументальна-мастацкім рамане-біяграфіі. Як вядома, і гэта меркаванне стала ўжо класічным, А. Лойка стварыў «рамантызаваны» вобраз паэта і разам з тым з высокай патрабавальнасцю да гістарычнай праўды ўзнавіў атмасферу складанага часу *[4]*.

Аўтарская трактоўка лёсу Янкі Купалы ўвасоблена ў непарыўным адзінстве з айчыннай гісторыяй. У мікраасяроддзе рамана ўваходзяць асобы, якія ў розны час аказалі ўплыў на фарміраванне свядомасці беларускага песняра. Асяроддзем у творы выступае нязменна складаная грамадская сітуацыя таго часу, багатага на розныя гістарычныя падзеі. Напрыканцы твора ўвага апавядальніка сканцэнтравалася на асэнсаванні духоўных здабыткаў: народны паэт прадстаўлены ў творы прадаўжальнікам традыцый Яські-гаспадара з-пад Вільні і Мацея Бурачка, ідэйным выразнікам багатай на грамадскія зрухі эпохі, паэтам з ласкі Божай, які здолеў узняцца над сваім часам. Рамантызацыя асобы Янкі Купалы спалучалася з рэалістычным паказам часу, грамадска-палітычных абставін пісьменніцкай дзейнасці. Свабодны эсэісцкі стыль дазваляе пісьменніку звярнуцца да дэталёвай мастацкай рэканструкцыі асобных малавядомых момантаў біяграфіі знакамітага песняра *[5]*.

У рамане «Як агонь, як вада…» творчы і чалавечы партрэт Янкі Купалы ўзнаўляецца сэнсава поўна. А. Лойка палемічна пытаецца: калі бывае, што легенда пра чалавека апярэджвае чалавека? Дэталёва аналізуе тыя грамадскія акалічнасці, якія абумовілі тое, што легенда пра выключнага паэта разнеслася па Беларусі надзвычай хутка і пачала апярэджваць яго самога. У біяграфіі Янкі Купалы, як і Максіма Багдановіча, Цёткі, значнае месца займае Вільня, «перадавая, шматнацыянальная, дэмакратычная – адзін са значных цэнтраў грамадска-палітычнага і культурна-нацыянальнага жыцця Расіі, Польшчы, Літвы, Беларусі пачатку ХХ стагоддзя» *[6, с. 74]*. Раманная сітуацыя вызначаецца тым, што галоўны герой паказваецца ў коле свайго прадстаўнічага мікраасяроддзя. Напрыклад, падкрэсліваецца, што ў 1909 годзе паэта найглыбей разумеў Уладзімір Іванавіч Самойла, яго настаўнік; пра літаратурныя прыярытэты сведчыць Ластоўскі, які зазначае, што Купала хваліў Блока і Славацкага. Узаемаадносіны Антона Луцкевіча, Вацлава Ластоўскага, Янкі Купалы складваюцца шмат у чым няпроста, і А. Лойка з вышыні часу імкнецца выявіць асабістыя і грамадскія складнікі гэтай з’явы.

Псіхалагічнае даследаванне асобы паэткі і грамадскай дзеячкі Алаізы Пашкевіч прадстаўлена ў раманнай дылогіі Валянціны Коўтун «Крыж міласэрнасці» (1988). У прадмове да твора пісьменніца называе Цётку выдатнай пераемніцай Францішка Багушэвіча і папярэдніцай Янкі Купалы, Якуба Коласа, Максіма Багдановіча. У цэнтры ўвагі вобраз Цёткі, які «вырастае і з успамінаў пра яе (напрыклад, Ядвігіна Ш., Яўгена Хлябцэвіча, Уладзіславы Луцкевіч), і з тых архіўных дакументаў, якія старанна захоўваюцца ў архівах Вільнюса, Ленінграда, Масквы, Мінска» *[7, с. 7]*. У якасці творчай задачы заяўлена таксама ўзнаўленне грамадскай атмасферы часу, сацыяльных пераўтварэнняў, побытавага асяроддзя. Як трапна зазначае В.І. Локун, «Крыж міласэрнасці» – кніга тэматычна багатая, аднолькава дакументальная і мастацкая, «часам нават нельга зразумець, дзе канчаецца дакумент, гістарычны факт і пачынаецца „творчасць“ <…> твор гэты, які вельмі моцны ў плане псіхалагічным, больш адпавядае прозе інтэлектуальнай. Гэта да ўсяго сінтэз рамана біяграфічнага і інтэлектуальнага» *[8, с. 721]*.

І сёння палемічным застаецца пытанне пра жанравую спецыфіку твора, паколькі некаторыя даследчыкі абгрунтавана разглядаюць яго як прыклад гістарычнай прозы, у паасобных выпадках і таксама аргументавана – як класічны раман у традыцыйным разуменні гэтага жанру. Патрабуе ўдакладнення ацэнка мастацкага палатна як творчай біяграфіі вядомай асобы, вакол якой сканцэнтравана мастацкае дзеянне. У рамане падрабязна прасочваецца станаўленне асобы, паколькі Алаіза Пашкевіч праз спасціжэнне міласэрнасці прыходзіць да хрысціянскага светаразумення, да абавязку чалавека несці духоўны «крыж». Галоўная гераіня не столькі ўзаемадзейнічае са сваім мікраасяроддзем, колькі спазнае шматаспектную грамадскую рэчаіснасць, дзе раскрываюцца прадстаўнікі розных сацыяльных пластоў. У рэчышчы часавых сувязей прасочваюцца таксама прычынна-выніковыя: у мастацкі аповед удала ўведзены цытаты з твораў Цёткі, якія ўяўляюць сабой эмацыянальны водгук на грамадскія падзеі, лаканічна апавядаецца пра гісторыю напісання некаторых твораў, паслядоўна падкрэсліваецца іх сацыяльная вартасць. Такім чынам, творчы працэс інтэрпрэтуецца як вынік усведамлення складаных сацыяльных з'яў, якія павінны атрымаць шчырую ацэнку мастачкі слова, важную для фарміравання грамадскай думкі.

Жаночыя вобразы ў рамане «Крыж міласэрнасці», у прыватнасці вобраз Цёткі, разглядае Т. Фіцнер і адзначае, што вобраз галоўнай гераіні «ўбірае ў сябе адначасна біяграфічныя звесткі пра А. Пашкевіч і светабачанне, асабісты вопыт В. Коўтун» *[9, с. 12]*. Так, другарадныя жаночыя вобразы даюць магчымасць прасачыць, з якімі асобамі ідэнтыфікуе сябе, а ад каго дыстанцыянуецца раманная Цётка. Нельга не пагадзіцца і з тым, што аўтарка не зусім лагічная пры паказе некаторых момантаў з асабістага жыцця Алаізы Пашкевіч, у прыватнасці шлюбу са Сцяпонасам Кайрысам.

Хранікальны сюжэт з элементамі канцэнтрычнага вызначае спецыфіку рамана, дзе дамінуе суб'ектыўнае пісьмо. Напрыклад, вачыма галоўнай гераіні чытач бачыць пастаноўку «Пінскай шляхты» ў выкананні вандроўнай трупы, а таксама жывую эмацыянальную рэакцыю простых людзей. Алаіза і сама ўражана паэтычным словам Вінцэнта Дуніна-Марцінкевіча, калі адзін з акцёраў чытае «па-свойму, той самай гаворкаю, на якой… У сваіх жа вёсках… А людзі слухаюць. Слухаюць вершык, напісаны па-мужыцку! Слухаюць тое, што яна душыць у сабе ўсе гэтыя бясконцыя гады, а яно ўсё роўна вырываецца і амаль даводзіць яе да бясцямнасці» *[10, с. 18]*.

Значны ўплыў на светапогляд Алаізы аказвае творчасць у той час папулярнай сярод моладзі «вялікай гродзенскай самотніцы» Элізы Ажэшкі. У рамане шматзначна паказваецца іх кароткая сустрэча, падчас якой вядомая пісьменніца называе Алаізу душой з магутным эмацыянальным патэнцыялам, прадказвае ёй адметны творчы лёс. Хвалюе творчае ўяўленне маладой асобы «Дудка беларуская» Францішка Багушэвіча, чыё «слова, падобнае на вогненны шар, можа каціцца па гразкай дарозе, па лузе і полі. Ажно людзі з хат выбягаюць. Яна бачыць гэта на ўласныя вочы…» *[10, с. 93]*, што выяўляе і літаратурны талент Алаізы, і ўсведамленне грамадскага прызначэння творчасці.

У рамане эпізадычна паказваюцца многія рэальныя гістарычныя асобы, якія ўплываюць на стварэнне тагачаснай грамадскай атмасферы. Напрыклад, губернскі «дваранскі прадвадзіцель» граф дэ Броэль-Плятэр ужо немалады, але даволі франтаваты і рухавы чалавек, які цікавіцца маладымі і прыгожымі актрысамі. Больш

дэталёва раскрыты віленскі паліцмайстар Канстанцін Назімаў, які з лагоднай усмешкай кланяецца губернатарскай жонцы – княгіні Марыі Грузінскай, з недаверам ставіцца да сваіх падначаленых, уважліва адсочвае нелегальную літаратуру і акуратна збірае кампрамат на людзей, што патрапілі ў поле яго зроку. Свецкай ільвіцай выступае Магдалена Радзівіл, якая ўмее рабіць уражанне на іншых. Цікава, што, прыйшоўшы на сустрэчу з Магдаленай Радзівіл, Алаіза зусім не захапляецца свецкай размовай, якой не хапае ні шчырасці, ні змястоўнасці. Галоўная гераіня чуйна ўспрымае навакольны свет, кантактуе з рознымі прадстаўнікамі грамадства: і чыноўнікамі, і магнатамі, а найболей з мяшчанамі і з сялянамі. Пры гэтым В. Коўтун акцэнтуе, што Алаізе блізкія перажыванні і цяжкасці шырокіх грамадскіх колаў, яе творчае гарэнне патрабуе дзейнасці.


Валянціна Коўтун

У творы лаканічна апісваюцца персанажы, чыя прыкметная роля традыцыйна адзначаецца ў біяграфіі Цёткі, у прыватнасці Вера Міхайлаўна Прозарава. Як дасведчаны выкладчык і арыгінальны рытар, здольны на дасціпны жарт, раскрываецца Пётр Францавіч Лесгафт. Узнаўленню мастацкіх партрэтаў бацькоў і сваякоў Алаізы аддадзена нязначная аўтарская ўвага. Так, бацька пісьменніцы Стэфан Пашкевіч паказаны працавітым, руплівым гаспадаром, ашчадным да грошай, праз што былі сваркі і з дачкою. Алаіза, хоць і паходзіла з заможнай сялянскай сям'і, пастаянна падпрацоўвала хатняй настаўніцай, што ў цэлым было тыповым заняткам студэнтаў таго часу.

В. Коўтун падкрэслівае, што грамадска свядомыя людзі, якія атрымліваюць адукацыю, бачаць сваё прызначэнне ў тым, каб несці асвету непісьменнаму сялянству. Узорным прыкладам такіх паводзін выступае сама Алаіза. На яе светапогляд таксама ўплывае прагрэсіўна настроенае пецярбургскае студэнцтва, дзе знаходзяцца шчырыя сябры. У гэтым творчым асяроддзі ўдзячныя чытачы, а найболей слухачы дапамагаюць маладой аўтарцы паверыць у свае сілы, пераканацца ў тым, што паэтычнае слова моцна ўплывае на людзей. Пецярбург таксама паказваецца значным культурным цэнтрам таго часу. А. Лойка, метафарычна характарызуючы ўздым у творчай дзейнасці песняра, называе перыяд 1910–1913 гадоў «белымі начамі Купалы». На гэта ўплывае найперш спрыяльнае найбліжэйшае атачэнне: «Паэта ў Пецярбургу вельмі радасна вітаў прафесар Браніслаў Ігнатавіч Эпімах-Шыпіла» *[6, с. 117]*, акрыляе дзейнасць беларускага літаратурна-навуковага гурта студэнтаў Пецярбургскага ўніверсітэта, рамантычныя адносіны з Паўлінай Мядзёлкай. Грамадская сітуацыя ў літаратурных колах раскрываецца ў цэлым праз высокую ацэнку, дадзеную Максімам Горкім Купалавай «Жалейцы» і Коласавым «Песням-жальбам». Аналізуецца гісторыя вядомага пісьма Горкага да Міхайлы Кацюбінскага, якое даволі доўгі час не зусім карэктна цытавалася беларускімі крытыкамі.

У другой кнізе В. Коўтун настрой галоўнай гераіні і акаляючага яе грамадскага асяроддзя адлюстроўваецца ў тым ліку дзякуючы прыватнай перапісцы Алаізы з Андрэем Гмыракам. Спачатку сяброўская, а потым рамантычная лінія ўзаемаадносін герояў выступае скразной у дылогіі, паколькі Андрэй адцяняе памкненні маладой пісьменніцы, у некаторых момантах з ёю кантрастуе. У адным са сваіх пісьмаў Алаіза Пашкевіч згадвае пецярбургскіх аднадумцаў, з якімі марылася пра выданне беларускіх кніг, актыўнае культурнае жыццё. Не ўсе засталіся вернымі абраным ідэалам. Напрыклад, Антоні Валэйко, запрошаны ў Вену мастаком пісаць партрэты сваякоў графа Патоцкага, адразу ж мяняе праваслаўнае веравызнанне на каталіцкае. І Алаіза палемічна пытаецца, як «можа чалавек, асабліва таленавіты, узносіць вочы ў неба толькі дзеля таго, каб нешта вытандляваць у Бога?!» *[10, с. 292]*. Сапраўдны талент, пераканана Алаіза, не разменьвае сваю душу на залатоўкі, не здраджвае Бацькаўшчыне.

В. Коўтун выкарыстоўвае не толькі «Я»-апавядальную стратэгію паказу асобы, але і раскрывае галоўную гераіню праз яе ўспрыманне эпізадычным персанажам. Напрыклад, Вітольду Чыжу новая знаёмая не спа-

дабалася: «Не па-жаночы катэгарычная, лішне ганарыстая. Праглядвалася ў ёй і нешта аскетычнае, зацятае» *[10, с. 302]*. Вітольд напачатку бачыць у Алаізе нігілістку, а пасля сам сабе баіцца прызнацца, што закахаўся ў яе. Такім чынам падкрэсліваецца выключнасць асобы Алаізы Пашкевіч. Такая псіхалагічная рыса, як духоўная дасканаласць, устаноўка на ідэалізацыю гераіні больш паслядоўнае выяўленне атрымае ў рамане-жыцці «Пакліканыя» (1998–2007), прысвечаным Ефрасінні Полацкай, дзе біяграфічны план спрыяе стварэнню пераканаўчага вобраза гістарычнага часу.

У дылогіі разглядаюцца знешнія, найперш сацыяльныя фактары, якія істотна ўплываюць на станаўленне творчай індывідуальнасці, паслядоўна падкрэсліваецца грамадская значнасць таленту Цёткі. «Крыж міласэрнасці» выступае тыповай змястоўнай формай для свайго літаратурнага перыяду: рэпрэзентуе жанравыя адзнакі класічнага рамана з узмоцненай біяграфічнай асновай, з па-мастацку даследаванымі грамадска-сацыяльнымі працэсамі. У цэнтры раманнай сітуацыі – вобраз маладой Алаізы, які шматгранна раскрываецца не столькі ў мікраасяроддзі, колькі ў шырокім асяроддзі тагачаснага грамадства. Мастацкае палатно вызначаецца дынамічнай зменай топасу, што падпарадкавана паслядоўнаму адлюстраванню біяграфічнай асновы: гэта найперш Лідчына, Гародня, Вільня, Коўна, Пецярбург, Мінск, а таксама Львоўшчына, Кракаў, Рым, Венецыя.

Грамадская дзейнасць творчай асобы кантрастуе з падзеямі Першай сусветнай вайны, якая ахапіла Гарадзеншчыну і набліжаецца да Вільні, а «галодны і халодны Мінск запоўніўся бежанцамі» *[10, с. 475]*. На фронце гіне малодшы брат Алаізы Юзік, уся сям'я балюча перажывае гэту трагедыю. Маладая пісьменніца паказана ў цэнтры літаратурна-грамадскага руху, выдае «Лучынку», якую чытаюць Янка Купала, Канстанцыя Буйло (Костка Буйлянка) і многія іншыя. Літаратурная атмасфера, яе чалавечыя складнікі, паказваюцца праз сяброўскія адносіны з Купалам, які называе Алаізу Цётачкай. Валянціна Коўтун акцэнтуе ўвагу на найлепшых праявах чалавечых узаемаадносін, якія ўпрыгожваюць жыццё.

Невыпадкова А. Лойка таксама падкрэслівае, што сяброўства Купалы з Цёткай – гэта вялікая, светлая старонка жыцця беларускага песняра. Цётка была «надзвычай пачуццёвай, экзальтаванай да бяспамяцці. Яна магла на калені ўпасці перад талентам, як веруючы падае перад іконаю» *[6, с. 185]*. Незвычайнага чалавека ў пісьменніцы Купала адчуў яшчэ па зборніку «Скрыпка беларуская», ён, як вядома, напісаў верш «Аўтарцы „Скрыпкі беларускай“». Паводле ўспамінаў Уладзіславы Францаўны, Цётка з сардэчнай цеплынёй і чуласцю адносілася да Янкі Купалы, кожны новы яго верш успрымала як вялікую падзею. Як пераканаўча доказвае А. Лойка, Цётка любіла ў Купалу Паэта, Талент, і яна сама была для Купалы незвычайнай, загадкавай, маланкавай. Такім чынам, у творах «Крыж міласэрнасці», «Як агонь, як вада…» вядомыя прадстаўнікі беларускай інтэлігенцыі паказваюцца ў святле маральна-этычных узаемаадносін.

Адметны жанравы сінтэз паказаны ў рамане-даследаванні «Каханне і смерць, або Лёс Максіма Багдановіча» (1995) Яўгена Міклашэўскага, дзе прасочваўся жыццёвы і творчы шлях выдатнага паэта. Аўтар уключыў у мастацкую тканіну ўспаміны сучаснікаў Багдановіча, архіўныя дакументы, прапанаваў сваю трактоўку спрэчных момантаў біяграфіі класіка праз параўнанне сведчанняў розных знаёмых пісьменніка. Для аб'ектыўнага прадстаўлення матэрыялу ў творы шырока выкарыстоўваецца метадалогія літаратуразнаўчага даследавання, асоба Максіма Багдановіча разглядаецца найперш як феномен свайго асяроддзя і часу.

Асновай выступаюць вядомыя «Матэрыялы да біяграфіі Максіма Адамавіча Багдановіча», напісаныя бацькам паэта – Адамам Ягоравічам Багдановічам у 1923 годзе для Інстытута беларускай культуры. Яўген Міклашэўскі дапаўняе і ўдакладняе ўспаміны Адама Ягоравіча пра сына, выкарыстоўвае розныя крыніцы інфармацыі для стварэння поўнага і дэталёвага аповеду, пачынаючы з 1885 і заканчваючы 1917 годам. У выніку ў творы комплексна спалучаны традыцыйнае філалагічнае даследаванне, эстэтычныя магчымасці біяграфіі, эсэістычная рэканструкцыя малавядомых момантаў жыццёвага і творчага шляху, палымянае публіцыстычнае выступленне. У раманнай сітуацыі аўтарская ўвага скіравана не толькі на выключную асобу галоўнага героя, але і на шматграннае даследаванне ўплываў, абставін, працэсаў, якія мелі месца на жыццёвым і творчым шляху Максіма Багдановіча. Такім чынам, у мікраасяроддзе твора ўваходзіць значная



Яўген Міклашэўскі

колькасць персанажаў, якія не адпавядаюць вызначэнню як эпізадычных або другарадных.

У тыповых біяграфічных каардынатах падаюцца звесткі з радаводу Максіма Багдановіча. Маці паэта Марыя Мякота мела прыроджанае пачуццё праўды і справядлівасці, і «можна думаць, што гэткае ж пачуццё было ўласціва і яе маці, якая мела такі ж „неўраўнаважаны і эксцэнтрычны" характар» *[11, с. 13]*. Пісьменнік пераканаўча паказвае, што Максім атрымаў у спадчыну імкненне да праўды і справядлівасці, разам з тым на асобу творцы аказала вырашальны ўплыў сямейнае выхаванне. Страціўшы маці ў раннім узросце, будучы класік беларускай літаратуры не быў духоўна блізкім ні з бацькам, ні з братамі. Яўген Міклашэўскі аналізуе вытокі захаплення беларускім прыгожым пісьменствам у неспрыяльных сацыяльных і культурных умовах. У прыватнасці, дэталёва разглядае такі факт, што хросная маці Максіма Вольга Сёмава заўважыла і падтрымала «яшчэ не да канца ўсвядомленую, атавістычную, як паэт скажа пазней, цягу да роднай зямлі, гарачай зацікаўленасці жыццём і лёсам свайго народа, захапленне беларускім этнасам» *[11, с. 99]*, і гэта пацвярджаецца іх васьмігадовай перапіскай.

У творы паслядоўна паказваецца партрэт і Адама Багдановіча – кніжніка, які сабраў багатую бібліятэку, этнографа, педагога, што распрацаваў уласную сістэму навучання. Дзеці ў сям'і Багдановічаў знаёміліся з рускімі народнымі казкамі ў запісах Афанасьева, з беларускімі народнымі казкамі ў запісах Багдановіча, Раманава, Шэйна, рускімі былінамі, сербскімі і балгарскімі песнямі і былінамі, знакамітым эпасам народаў свету. У рамане паслядоўна адлюстроўваецца побыт сям'і з інтэлігенцкага асяроддзя, якая ўзаемадзейнічае ў тым ліку з вядомымі людзьмі свайго часу. Пасля смерці першай жонкі Адам Багдановіч пераязджае з сям'ёй у Ніжні Ноўгарад, дзе знаёміцца з Аляксеем Пешкавым (Горкім). Апошні, тады яшчэ малады пісьменнік, які зарабляе сабе на жыццё газетнай працай, чытае Багдановічу «Песню пра Сокала», з чаго і пачынаюцца адносна нядоўгія, але амаль сяброўскія стасункі.

Пісьменнік вылучае асобныя моманты з біяграфічнай канвы, якія ацэньвае як даволі значныя, прыводзячы ў тым ліку і суб'ектыўныя аргументы. У прыватнасці, зазначаецца, што першапачатковую канфліктную ролю ў адносінах Багдановіча і Горкага адыграла несупадзенне іх ацэнак, дадзеных цяпер вядомаму літаратурнаму твору – апавяданню Чэхава «Дама з сабачкам». Паслядоўнае ўзнаўленне сітуацыі стварае разуменне той атмасферы, у якой выхоўваўся Максім Багдановіч. Падсумоўваючы праведзенае даследаванне, аўтар вычарпальна тлумачыць, што духоўная адчужанасць бацькі і сына выклікана сямейнымі складанасцямі. Невыпадкова Максім, які не прымае мачаху – родную цётку, пасля выхаду знакамітага «Вянка» не падпісвае зборнік ні бацьку, ні брату.

Як і ў эсэістычнай жанравай разнавіднасці рамана, Яўген Міклашэўскі падае паслядоўную псіхалагічную характарыстыку, асэнсоўвае праявы таленту і чалавечыя ўчынкі галоўнага героя. У прыватнасці, адзначаецца незвычайная цярплівасць і ўпартасць у характары яшчэ маленькага Максіма, без чаго нельга было б выканаць такую тытанічную працу, якая чакала будучага класіка беларускай літаратуры. Гісторыя напісання знакамітых «Слуцкіх ткачых» шмат у чым раскрывае характар таленту: уражанне, якое зрабілі на Максіма Багдановіча слуцкія паясы з калекцыі Івана Луцкевіча, стала вытокам натхнення, з якім на адным дыханні быў створаны верш. Разам з тым Яўген Міклашэўскі паслядоўна зазначае, што Максім Багдановіч звычайна шмат працаваў над сваімі творамі, рэдагаваў, удакладняў і перапісваў. Такім чынам, феномен таленту вытлумачваецца як незвычайная адоранасць у спалучэнні з выключнай працавітасцю.

Кожная з пяці частак рамана мае ўласную назву, якая абазначае сэнсавую дамінанту: «Марылька», «Бацька і дзеці», «Яраслаўль – Вільня», «Ліцэй», «Разам з народам». Калі першыя чатыры часткі лагічна адпавядаюць

біяграфічнай канве, на аснове якой вядзецца аўтарскае даследаванне, то пятая частка, якая грунтуецца ўжо не на бацькоўскіх успамінах, а на прадстаўнічых сведчаннях тагачаснай беларускай інтэлігенцыі, вызначаецца эпісталярным сінтэзам, грамадзянскім пафасам і завостранасцю філасофскага зместу. Так, на падставе ўспамінаў Зоські Верас Яўген Міклашэўскі сцвярджае, што Максім Багдановіч у «Страцім-лебедзі» З. Бядулі мае толькі прыблізнае падабенства з прататыпам, паколькі ў «вобразе Максіма зліліся і рысы Багдановіча, і рысы самаго Бядулі» *[11, с. 360]*.

Сведчанні Аркадзя Смоліча і Змітрака Бядулі выступаюць асноўнымі крыніцамі звестак пра час знаходжання Максіма Багдановіча ў прыфрантавым Менску да яго ад'езду ў Ялту, пры гэтым у выніку комплекснага супастаўлення яны вывяраюцца і ўдакладняюцца. Пісьменнік не адлюстроўвае апошнія дні жыцця знакамітага беларускага творцы. Завяршаецца аповед лаканічным паведамленнем, што праводзіў Багдановіча на вакзал Аркадзь Смоліч, і шматсэнсоўным філасофскім падагульненнем: «І, напэўна, ніхто не думаў тады, што праводзяць яго назаўсёды – у Вечнасць, адкуль ён потым вернецца на родную зямлю як геніяльны паэт і вялікі сын беларускага народа» *[11, с. 367]*.

Такім чынам, раман-даследаванне дазваляе не толькі творча ўзнавіць літаратурную біяграфію асобы, але і вылучыць сэнсавызначальныя моманты, шматгранна акрэсліць іх аўтарскае бачанне. Прадстаўлены «погляд знутры» на жыццёвы і творчы шлях галоўнага героя выступае пераканаўчым для чытача. Мастацкае даследаванне трансфармуе раманную сітуацыю, пашырае стылёвы дыяпазон выяўленчых сродкаў, гарманічна спалучаецца з філасофскай раманнай канцэптуальнасцю. Раман-даследаванне «Каханне і смерць, або Лёс Максіма Багдановіча» Яўгена Міклашэўскага рэпрэзентуе доказную аўтарскую версію, якая вытлумачвае фенаменальнасць беларускага класіка.

*Артыкул паступіў у рэдакцыю 23.06.2022 г.*

## СПІС ВЫКАРЫСТАНЫХ КРЫНІЦ


1. Саверчанка, І. Майстры слова і Беларуская акадэмія навук / І. Саверчанка // Наука и инновации. – 2018. – № 12. – С. 4–11.
2. Бугаёў, Д.Я. Перамагае талент / Д.Я. Бугаёў // Арганічнасць таленту: літ.-крыт. арт. / Д.Я. Бугаёў. – Мінск, 1989. – С. 187–201.
3. Штэйнер, І. «І прыйдзе вучань твой…»: да 90-годдзя з дня нараджэння Алега Лойкі / І. Штэйнер // Роднае слова. – 2021. – № 5. – С. 15–18.
4. Кароткая, Л. «Я ўсім хачу дабра…» / Л. Кароткая // Жывое, роднае…: літ.-крыт. арт. / Л. Кароткая. – Мінск, 1989. – С. 61–84.
5. Навасельцава, Г.В. Жанр рамана ў беларускай літаратуры другой паловы ХХ – пачатку ХХІ стагоддзя: манаграфія / Г.В. Навасельцава. – Віцебск: ВДУ імя П.М. Машэрава, 2020. – 268 с.
6. Лойка, А. Як агонь, як вада: раман-эсэ пра Янку Купалу: для ст. шк. узросту / А. Лойка. – Мінск: Маст. літ., 2000. – 478 с.
7. Коўтун, В. Гэта было жыццё / В. Коўтун // Крыж міласэрнасці: раман: кн. 1 / В. Коўтун. – Мінск, 1988. – С. 3–8.
8. Локун, В.І. Валянціна Коўтун / В.І. Локун // Гісторыя беларускай літаратуры ХХ стагоддзя: у 4 т / НАН Беларусі, Аддз-не гуманітар. навук і мастацтваў, Цэнтр даслед. беларус. культуры, мовы і літ.; навук. рэд. У.В. Гніламёдаў, С.С. Лаўшук. – Мінск: Беларус. навука, 2015. – Т. 4, кн. 3. – С. 704–736.
9. Фіцнер, Т. Жаночыя вобразы рамана «Крыж міласэрнасці» Валянціны Коўтун праз прызму «жаночага чытання»: вобраз Цёткі / Т. Фіцнер // Роднае слова. – 2016. – № 4. – С. 12–15.
10. Коўтун, В. Крыж міласэрнасці: раман: для ст. шк. узросту / В. Коўтун. – Мінск: Маст. літ., 1996. – 493 с.
11. Міклашэўскі, Я. Каханне і смерць, або Лёс Максіма Багдановіча: раман-даследаванне / Я. Міклашэўскі. – Мінск: Маст. літ., 1995. – 367 с.